**МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

Установа адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка"

Факультэт беларускай і рускай філалогіі

Кафедра беларускага мовазнаўства

Руц
Канстанцін Фёдаравіч

# Фанетычная і граматычная сістэмы гаворак цэнтральнага Палесся

Дыпломнае даследаванне

Навуковы кіраўнік –
кандыдат філалагічных навук
дацэнт Міхайлаў П.А.

Мінск, 2011

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Рэзюмэ

Руц Канстанцін Фёдаравіч

### Фанетычная і граматычная сістэмы гаворак цэнтральнага Палесся

**Ключавыя словы**: цэнтральнае Палессе, дыялекталогія, фанема, фанетычны працэс, націскны вакалізм, ненаціскны вакалізм, кансанантызм, гаворка з оканнем, гаворка з аканнем, назоўнік, прыметнік, займеннік, дзеяслоў.

**Аб'ект даследавання**: гаворкі цэнтральнага Палесся.

**Прадмет даследавання**: фанетычная і граматычная сістэмы гаворак цэнтральнага Палесся.

**Мэта даследавання**:комплекснае і сістэмнае вывучэнне фанетычных і марфалагічных рыс гаворак цэнтральнага Палесся.

**Метады праведзенага даследавання**: апісальны, супастаўляльны.

**Навуковая навізна атрыманых вынікаў** заключаецца ў комплексным і сістэмным вывучэнні гаворак цэнтральнага Палесся, як гаворак у зоне міждыялектных кантактаў, якія яшчэ не былі аб'ектам спецыяльнага манаграфічнага даследавання, у выяўленні моўных рыс, характэрных для маўлення жыхароў гэтага рэгіёна, устанаўленні групоўкі даследаваных гаворак і правядзення дакладных межаў паміж імі на азначанай тэрыторыі.

**Практычная значнасць атрыманых вынікаў**. Матэрыялы і асноўныя палажэнні даследавання могуць знайсці прымяненне ў выкладанні курсаў "Беларуская дыялекталогія" і "Сучасная беларуская літаратурная мова", пры распрацоўцы спецкурсаў і спецсемінараў, пры напісанні курсавых і дыпломных прац студэнтамі ВНУ Рэспублікі Беларусь.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ